## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● МІЖВУЗАЎСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ ● ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: КАЛІ ПАДЫСЦІ ДА СПРАВЫ СУР'ЁЗНА ● З КРЫНІЦЫ, ІМЯ ЯКОЙ — ФАКТ ● УВАГА! НОВАЯ РУБРЫКА ● ЛІНГАФОННЫ КАБІНЕТ — ПАМОЧНІК СТУДЭНТА Ў ЧАС СЕСІІ ● КНІГІ ВЫДАВЕЦТВА БДУ ● УЗЛЁТ ДА ЗОР, ДА ПОДЗВІГУ, ДА ШЧАСЦЯ ● ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ ТУРЫЗМУ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ● ЗІМОВАЯ СЕСІЯ НА КАФЕДРЫ СМЕХАРОБСТВА.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 2 (1228) 18 студзеня 1979 г. Цана 2 кап.

# КАНФЕРЭНЦЫЯ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

Маладыя вучоныя БДУ разам з усім калектывам універсітэта дастойна сустрэлі слаўны юбілей — 60-годдзе БССР і КПБ. Яны ўдзельнічалі ў шматлікіх мерапрыемствах, прысвечаных гэтай падзеі. Адным з важнейшых сярод іх можна назваць навукова-практычную канферэнцыю па грамадскіх і прыродазнаўчых навуках, якую арганізавалі сумесна саветы маладых вучоных БДУ, БПІ і МРТІ.

Канкрэтная тэматыка даследаванняў вызначыла арганізацыю 6 секцый, на якія ад універсітэта было прадстаўлена 76 дакладаў. Праходзіла канферэнцыя ў БПІ. Трэба адзначыць, што гаспадары яе праявілі вялікую энергію і аператыўнасць у вырашэнні шэрагу арганізацыйных пытанняў, стварылі добрыя ўмовы для работы канферэнцыі. Нямала папрацавалі і актывісты савета маладых вучоных БДУ, асабліва Ю. Харын (факультэт прыкладной матэматыкі), В. Пятроўскі (савет кафедр грамадскіх навук), С. Вятохін (фізічны факультэт). Да дня адкрыцця канферэнцыі былі сабраны тэзісы дакладаў для наступнага іх апублікавання.

На пленарным пасяджэнні ўдзельнікаў канферэнцыі віталі прарэктар БПІ па навуковай рабоце прафесар А. В. Сцепаненка, член бюро савета маладых вучоных пры ЦК ЛКСМБ Г. Куляшоў, старшыня гарадскога савета маладых вучоных С. Котаў. З дакладам на тэму «Вялікі Кастрычнік і ўтварэнне БССР» выступіў прафесар І. І. Саладкоў. З цікавасцю былі заслуханы таксама выступленні старшынь саветаў маладых вучоных БПІ Б. Камракова «Аб развіцці матэматыкі ў Беларусі» і БДУ А. Патрына «Дасягненні маладых вучоных-фізікаў Беларусі». Вялікую цікавасць у прысутных выклікалі даклады аспіранта кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў І. Я. Шыршова «Культура як жывая інфармацыйная сістэма», а таксама асістэнта кафедры ядзернай фізікі В. Л Гурачэўскага і аспіранта М. М. Абрамчука «Ядзерна-фізічны эксперымент на лініі з міні-ЭВМ».

Двухдзённыя пасяджэнні па секцыях пацвердзілі карыснасць зносін маладых вучоных розных ВНУ. Ажыўленыя дыскусіі ішлі ў секцыях фізікі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, у секцыі філасофіі.

Правядзенне канферэнцыі было першым крокам на шляху міжвузаўскай садружнасці маладых вучоных БДУ, БПІ і МРТІ. Правядзенне міжвузаўскіх канферэнцый такога роду плануецца зрабіць штогоднім, узгадняюцца і іншыя формы садружнасці ў рабоце саветаў маладых вучоных.

**А. ЦІТОВА,**
**член савета маладых вучоных БДУ.**

**На здымках:** у зале; выступае старшыня савета маладых вучоных БДУ, дацэнт А. Патрын.

Фота **М. Драздова.**





ПА БДУ
ІНФАРМАЦЫЯ

# Калі падысці да справы сур'ёзна

**Вялікую ўвагу ўдзяляюць рэктарат, партком, камітэт камсамола універсітэта рабоце факультэта грамадскіх прафесій. Дапамагчы падрыхтаваць высокакваліфікаванага спецыяліста, рознабакова развітую асобу, актыўнага барацьбіта за камуністычную будучыню — такія задачы стаяць увогуле перад ФГП. Аб тым, як выконвае іх факультэт, і аб мерах па паляпшэнню яго работы і ішла гутарка на апошнім пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта.**

**З дакладам па гэтаму пытанню выступіла дэкан факультэта грамадскіх прафесій Т. Я. Галко. Яна, у прыватнасці, падкрэсліла, што за апошні год ФГП дасягнуў станоўчых вынікаў, работа яго значна палепшылася, вырашан шэраг арганізацыйных пытанняў. Але існуюць яшчэ праблемы, рашыць якія павінны дапамагчы рэктарат, партком, прафсаюзная і камсамольская арганізацыі БДУ.**

**Садакладчыкам па разглядаемаму пытанню выступіла член парткома універсітэта А. М. Русакова.**

**Аб выніках агляду нагляднай агітацыі на факультэтах далажыў член парткома І. Ф. Раманоўскі. Ён адзначыў, што на многіх факультэтах наглядная агітацыя значна палепшылася. Добра папрацавалі ў гэтым напрамку фізічны, біялагічны, факультэт радыёфізікі і электронікі, філалагічны факультэт. На гэтых факультэтах наглядная агітацыя адпавядае тым патрабаванням, якія прад'яўляюцца да яе на сучасным этапе. Але, як адзначыў І. Ф. Раманоўскі, камісія ўстанавіла шэраг недахопаў, агульных для нагляднай агітацыі многіх факультэтаў. Гэта недастатковая прапаганда факультэтаў у нагляднай агітацыі; некаторыя партарганізацыі нават не прымаюць пастаноў аб тым, каб уключаць вынікі аглядаў-конкурсаў нагляднай агітацыі ў паказчыкі сацыялістычнага спаборніцтва; слабы ўдзел камсамольскіх арганізацый факультэтаў у гэтай важнай справе.**

**Па разгледжаных пытаннях партком прыняў пастанову.**

**Л. АНДРЭЕВА.**

З КРЫНІЦЫ, ІМЯ ЯКОЙ ФАКТ

# Цікавіць эканоміка

**Нядаўна на IV курсе біялагічнага факультэта адбылася канферэнцыя па курсу «Палітэканомія сацыялізму» на тэму «Павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і якасці прадукцыі — генеральны напрамак развіцця эканомікі развітога сацыялізму».**

**Усяго было заслухана і абмеркавана адзінаццаць дакладаў нашых студэнтаў. Першай выступіла студэнтка Г. Лукша з дакладам «Роля камсамола ў развіцці эканомікі БССР», у якім ярка і вобразна была раскрыта будзённая гераічная праца камсамола рэспублікі на будоўлях дзесятай пяцігодкі.**

**У выступленнях Я. Манінай, Т. Мазанік, П. Саўчынай, У. Мануліка разглядаліся фактары паляпшэння эфектыўнасці кіравання грамадскай прамысловасцю, павышэння дабрабыту народа.**

**Даклад Т. Цярэнцьевай «Сучасная НТР і выкарыстанне яе дасягненняў для стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму» выклікаў шмат цікавых пытанняў у слухачоў. Далей студэнткамі А. Долбік і В. Сычовай была раскрыта сутнасць і роля гасразліку ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці. Прысутнымі было ўзнята пытанне аб увядзенні гасразліку ў дзейнасць навукова-даследчых інстытутаў, у падрыхтоўку універсітэтамі і іншымі ВНУ спецыялістаў на планавай гасразліковай аснове ў розных галінах вытворчасці. Гэта павысіла б, на думку студэнтаў, эфектыўнасць спецыяльнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў і прадухіліла б размеркаванне выпускнікоў ВНУ не па прамой спецыялізацыі.**

**Абагульняючым было выступленне Г. Барздовай «Значэнне сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі ў павышэнні эфектыўнасці грамадскай вытворчасці». Быў разгледжан шэраг пытанняў унутранага характару ў краінах СЭУ, значэнне СЭУ ў нашы дні.**

**Пасля канферэнцыі адбылася экскурсія на ВДНГ БССР. Экскурсавод расказала пра дасягненні рэспублікі за 60 год Савецкай улады, затым мы агледзелі экспанаты. Выстаўку пракаменціравала наш лектар, дацэнт кафедры палітэканоміі сацыялізму Вольга Іванаўна Цакунова. Дзякуючы намаганням Вольгі Іванаўны і выкладчыка гэтай жа кафедры Канстанціна Мікалаевіча Харашуна канферэнцыя прайшла на высокім узроўні. Яна — яшчэ адзін крок у авалодванні ведамі.**

**В. КАНЮШКЕВІЧ,**
**студэнт IV курса біяфака.**

# Вопыт — перщакурснікам

**З журналістам Міхаілам Мікалаевічам Шыманскім мы былі знаёмы па яго цікавых матэрыялах і выступленнях на старонках газеты «Известия». Даўно хацелася нам, першакурснікам, убачыць прадстаўніка саюзнага друку, бліжэй пазнаёміцца з сакрэтамі нашай будучай прафесіі. І вось на факультэце журналістыкі адбылася сустрэча з карэспандэнтам газеты «Известия» М. М. Шыманскім. З захапленнем студэнты слухалі расказы аб творчых паездках журналіста, аб яго штодзённай працы над рашэннямі ўзнікаючых праблем. Асаблівую цікавасць выклікалі ў аўдыторыі словы М. М. Шыманскага аб высокай маральнай чысціні і адказнасці журналіста за сваю справу, аб яго цвёрдай ідэйнай пазіцыі, вернасці інтэрнацыянальнаму доўгу.**

**Многія аспекты дзейнасці журналіста закрануў М. М. Шыманскі ў адказах на пытанні студэнтаў. Усе былі вельмі ўдзячны вопытнаму журналісту, у мінулым выпускніку нашага факультэта, за яго цікавую гутарку.**

**С. БАГДАНОВІЧ,**
**студэнт І курса журфака.**




## Мэтанакіраванасць

Знаёмцеся: Міхаіл Стралец, студэнт трэцяга курса гістарычнага факультэта, выдатнік вучобы, член студэнцкага навуковага таварыства. Нашу з ім гутарку я прапаную чытачам.

**— Міша, скажы, калі ў цябе паявілася жаданне звязаць свой лёс з гістарычным факультэтам? Ці можа гэта сямейная традыцыя?**

— Не, у сям'і ў нас гісторыкаў не было. Я першы. А ўвогуле гісторыя як навука мяне вабіла даўно, бо яна цесна звязана з жыццём народа на ўсіх этапах яго развіцця. А ведаць мінулае, я лічу, павінен кожны чалавек. Памятаеце, у Герцэна: «Не варты будучага той народ, які не ведае свайго мінулага». З гэтым нельга не згадзіцца. Але без пэўнай сумы ведаў пазнаць мінулае цяжка. Я і абраў гісторыю таму, што ва ўсіх яе з'явах, фактах адчуваецца сам рытм жыцця — мінулага і цяперашняга.

**— Ты — член студэнцкага навуковага таварыства. Якая гістарычная тэма цябе больш хвалюе?**

— У студэнцкім навуковым таварыстве я з першага курса і лічу, што навуковай работай павінен займацца кожны студэнт. Яна прывучае нас да творчасці, дапамагае развіваць мысленне. І яшчэ, захапленне навуковай работай вучыць працаваць з дакументамі, першакрыніцамі. Дапамагае глыбей разабрацца ў карэнных праблемах міжнароднай палітыкі на сучасным этапе. Ну і, вядома, расшырае асабісты кругагляд.

Тэма маёй навуковай работы «Удзел БССР у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый». Чаму я яе выбраў? Перш за ўсё сама па сабе гэта вельмі цікавая тэма. Тут ёсць над чым падумаць, паразважаць. Пры распрацоўцы тэмы я выбіраю найбольш складаныя бакі дзейнасці БССР у ААН.

**— Я ведаю, што ты — удзельнік алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», што ты стаў прызёрам гэтай алімпіяды, заняў трэцяе месца. Што ты думаеш аб яе правядзенні?**

— Алімпіяда — гэта свайго роду форма навукова-тэхнічнага развіцця студэнтаў. Але я лічу, што гэта форма яшчэ не зусім дасканалая. Перш за ўсё трэба сканцэнтраваць увагу студэнтаў не на аднаўленні гістарычных фактаў (бо запомніць тую ці іншую дату не складае цяжкасці), а на пастаноўцы праблемных пытанняў. Студэнты павінны ўмець весці дыскусію, толькі тады веды будуць даваць пэўныя вынікі.

**— Міша, калі б табе зараз прапанавалі вярнуцца ў дзяцінства, з чаго б ты пачаў?**

— Вучыўся б толькі на выдатна. Сябраваў бы з гісторыяй. А ўсё ж я не хацеў бы туды вяртацца. Бо зараз у мяне шмат цікавых спраў.

**— І апошняе пытанне. Кім бы ты хацеў сябе бачыць, скажам, праз 10 гадоў?**

— На гэтае пытанне мне цяжка адказаць цяпер, uперадзе яшчэ два гады вучобы. Скажу адно: навукова-даследчая работа — мая мэта.

**Л. БЫКОЎСКАЯ.**

Увага! Новая рубрыка

# ЗНАЁМЦЕСЯ: НАШЫ СЯБРЫ

**У нашым універсітэце навучаюцца каля 700 студэнтаў, аспірантаў і стажораў з шасцідзесяці краін свету. Сёння мы адкрываем у нашай газеце новую рубрыку, якая дапаможа прадстаўнікам студэнцтва розных краін больш даведацца адзін аб адным, зразумець і падружыцца. Мы просім вас, нашы замежныя сябры, дасылаць нам матэрыялы, фатаграфіі, якія расказваюць аб вашых краінах, аб вашым народзе, аб яго культуры, традыцыях і нацыянальных святах, аб вашым жыцці і вучобе ў сценах нашага універсітэта.**

**У гэтым нумары газеты мы прадастаўляем слова студэнтам з Польскай Народнай Рэспублікі.**

**У. БУДАЙ,**
**старшы выкладчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных навучэнцаў, загадчык няштатнага аддзела інтэрнацыянальнага выхавання газеты «Беларускі універсітэт».**



Студэнты з ПНР Данута Грабоўска, Хана Вадас, Ежы Міхневіч, Данута Вуйцык, Магда Банік.

17 студзеня польскі народ адзначаў Дзень вызвалення Варшавы. 16 студзеня 1945 года быў аддадзен загад аб прарыве фронту на Вісле, і Чырвоная Армія пайшла наперад. У ноч на 17 студзеня нямецкія войскі, якія абараняліся ў раёне Варшавы, насуперак загаду Гітлера пачалі адыходзіць.

У наступленне перайшла першая армія Войска Польскага, якой быў прадастаўлен гонар першай уступіць у сталіцу Польшчы. Раніцай 17 студзеня часці яе ўварваліся ў Варшаву, і ў горадзе разгарнуліся баявыя дзеянні. Да 12 гадзін дня польскія і савецкія воіны поўнасцю вызвалілі горад.

У азнаменаванне гэтай перамогі Масква салютавала злучэнням Першага беларускага фронту і часцям першай арміі Войска Польскага, вызваліўшых сталіцу Польшчы, 24 артылерыйскімі залпамі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 чэрвеня 1945 года быў зацверджан медаль «За вызваленне Варшавы», якім узнагароджваліся ўдзельнікі баёў за гэты горад. Вызвалены горад прадстаўляў сабой жудаснае відовішча. Былой, квітнеючай Варшавы, адной з прыгажэйшых еўрапейскіх сталіц больш не існавала. Ворагі разбурылі і разграбілі сталіцу.

У горадзе былі ўзарваны амаль усе помнікі культуры і гісторыі польскага народа, у тым ліку помнік М. Каперніку, Ф. Шапэну, А. Міцкевічу, Невядомаму салдату, калона караля Сігізмунда III.

Сённяшняя сталіца Польшчы — прыгожы сучасны горад. Жыхары Варшавы з дапамогай усяго польскага народа і брацкага савецкага народа не толькі адбудавалі Варшаву, але і зрабілі яе яшчэ цудоўнейшай.

Варшавяне свята ўшаноўваюць памяць тых, хто аддаў сваё жыццё за вызваленне роднага горада.

**Данута ГРАБОЎСКА,**
**студэнтка III курса філалагічнага факультэта.**



Помнік вызваліцелям Варшавы.

# «Вам будуць прапанаваны задачы»

Як вы ўяўляеце студэнцкую аудыторыю будучага?

...Прыходзіце на практычныя заняткі, садзіцеся за пульт, націскаеце на кнопкі... Хвіліна — і ўмова задачы перад вамі. Вы хвалюецеся? Вас супакояць успыхнуўшыя словы на блакітным экранчыку: «Не хвалюйцеся, таварыш... Прапануем вам больш простую задачу. Калі вы здолееце яе рашыць, вам будзе прапанавана другая». Але... вы штосьці забыліся... Не, не трэба ліхаманкава перагортваць старонкі падручніка. Націсніце кнопку — і вы атрымаеце даведку. І ўсё ж задачка — ні з месца. Тады спрабуеце клавішу «Падкажы...» Ну, і ў самы крытычны момант, калі рашэнне задачы вы не ўяўляеце, зноў выратоўвае машына. Хвіліна... І на экране рашэнне.

Аднак машына не толькі фіксуе неабходныя для вас звесткі. Улічваючы вашы хістанні ў час рашэння і звяртанне «за дапамогай», яна ў канцы заняткаў паставіць вам зусім аб'ектыўную адзнаку...

Але ці будучыня гэта? Давайце заглянем у клас ЭВНС БДУ. Тры рады сталоў, і на кожным — пульт з некалькімі радамі жоўтых і чырвоных клавішаў і невялікі экран. Гэта і ёсць ЭВНС — электронна-вылічальная навучальная сістэма.

...Яўген Міхайлавіч Рахманько праводзіць практычныя заняткі па хіміі з другакурснікамі. На стале ў яго таксама пульт — экран. Націснуўшы тую або іншую клавішу, ён адразу даведаецца, каму патрэбна дапамога, якія цяжкасці выклікае тая або іншая задачка ў студэнта. Яўген Міхайлавіч падымае трубку тэлефона. Электронна-вылічальная сістэма загружана, можна прыступаць да практычных заняткаў.

...На блакітным экранчыку Ніны Сасіновіч паяўляюцца словы: «Таварыш Сасіновіч Н. Ф. Сёння вам будуць прапанаваны задачы па гетарагеннай раўнавазе»...

У хімікаў — звычайныя практычныя заняткі. За пультамі схіліліся галовы студэнтаў.

Падыдзем да Яўгена Міхайлавіча. Ён расказвае:

— Сістэма ЭВНС распрацавана ў нашым універсітэце некалькі гадоў назад на аснове работы электронна-вылічальнай машыны. Не абышлося без праблем. Якім чынам знайсці агульную мову студэнта з машынай? Ці зможа машына ўздзейнічаць на псіхіку чалавека? Задачы складаныя. Але спробы вырашэння іх ужо ёсць. Як вы заўважылі, наша ЭВНС мае тэрміналы, якія аблягчаюць зносіны паміж машынай і студэнтам: падбадзёрыць, падкажа, паставіць адзнаку і ў канцы нават не забудзе «сказаць»: «Запішыце заданне на дом. Да пабачэння».

— Яўген Міхайлавіч,— цікаўлюся,— якую дапамогу прапануе гэта сістэма непасрэдна выкладчыку?

— Як вы думаеце, колькі ў нас цяпер тут выкладчыкаў? — Бачачы маю разгубленасць, дадаў: — Не, не адзін, а шаснаццаць плюс адзін. Бо кожная сістэма па сутнасці замяняе выкладчыка. Другі бок справы. Не кожны студэнт адважыцца спытаць у выкладчыка штосьці, а размаўляць з сістэмай яму прасцей. ЭВНС дапамагае рацыянальна выкарыстоўваць час, хутка і якасна засвойваць пройдзены матэрыял.

...За пультам нумар 7—Таіса Жыгала. ЭВНС прапанавала ёй ужо трэцюю задачу. Дзяўчына ўпэўнена набірае вынік і глядзіць на экран: «Ваш адказ недакладны...» Таіса схіляецца над сшыткам.

Звяртаюся да Таісы:

— Якія, на твой погляд, недахопы сістэмы?

— На жаль, памяць і магчымасці машыны абмежаваны. Ёй лягчэй канстатаваць адказ у выглядзе лічбы і цяжэй — словам, паняццем, думкай. Ад нас, студэнтаў, машына патрабуе сабранасці і ўважлівасці. Паставіш, напрыклад, па няўважлівасці коску замест кропкі —і адказ няправільны...

Таіса выпраўляе недакладнасць, і на экране ўспыхваюць зялёныя літары:

«Правільна рашыўшы чарговую задачу, вы атрымалі права на рашэнне больш складанай».

Практычныя заняткі працягваюцца.

**Т. МАНЁНАК,**
**студэнтка III курса журфака.**

# АКРЫЛЕНАСЦЬ

Здараецца, што з зусім незнаёмым чалавекам вельмі хутка знаходзіш агульную тэму і праз некалькі хвілін размаўляеш, як са старым сябрам. Іменна такі чалавек Тамара Абрамчык, студэнтка V курса філалагічнага факультэта. Нездарма, калі мне рэкамендавалі напісаць пра яе, папярэдзілі — сустрэцца з Тамарай будзе складана. Ды гэта і лёгка растлумачыць: не так проста спалучаць вучобу, грамадскія абавязкі і работу над дыпломам.

Але вось мы сядзім ва ўтульным пакоі інтэрната, і Тамара расказвае аб сабе. Я амаль зачаравана ўслухоўваюся ў яе прыгожую простую мову. Так і павінна размаўляць студэнтка аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

Тамара — дыпламант агульнарэспубліканскай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Алімпіяда праводзілася ў два туры. Першы праходзіў ва універсітэце, пераможцы яго рэкамендаваліся для ўдзелу ў другім рэспубліканскім.

— Тамара, а як праходзіў гэты тур?

— Патрэбна было адказаць на чатыры пытанні, якія ўключалі расказ аб педагагічнай практыцы, грамадскім мерапрыемстве, праведзеным у групе ці на курсе, і выканаць заданні, звязаныя непасрэдна з будучай прафесіяй. Алімпіяда дапамагала развіццю навыкаў самастойнай работы, умацаванню камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі, расшырыла кругагляд яе ўдзельнікаў.

— Тамара, ты — член камітэта камсамола універсітэта, член Маскоўскага райкома камсамола, але гэта не перашкодзіла табе закончыць чацвёрты курс на выдатна. Як табе ўдаецца сумяшчаць выдатную вучобу з актыўнай грамадскай дзейнасцю?

— Было б жаданне і ахвота — усюды можна паспець, усё зрабіць.

Потым Тамара паказвае мне альбом з будатрадаўскімі фотаздымкамі. Растлумачвае:

— Я — ветэран СБА. Кожны год ездзіла працаваць у Малдавію. Спачатку радавым байцом, а апошнія два гады — камандзірам.

— Як вы працавалі ў гэтым годзе?

— Я была камандзірам зводнага будатрада ў Слабадзейскім раёне. Працавалі па-ўдарнаму, дапамагалі ўбіраць ураджай у Малдавіі.

Сапраўды стараліся рабяты. Сведчанне гэтаму — Ганаровая грамата ЦК ЛКСМ Малдавіі, грамата Слабадзейскага райкома камсамола, знак «Ганаровы баец Малдовы».

— А цяпер я працую над дыпломам, — працягвае Тамара.— Тэма курсавой і дыпломнай — «Беларуская арыгінальная лексікаграфія ў пасляваенны час». Тэма новая, амаль нідзе не распрацаваная.

Хочацца дадаць, што ў сувязі з 60-годдзем БССР і КПБ Мінскі абком камсамола ўзнагародзіў Тамару Абрамчык Ганаровай граматай за поспехі ў вучобе і актыўную грамадскую дзейнасць.

**І. ЕМЕЛЬЯНОВІЧ.**



**На здымку: Т. Абрамчык.**
**Фота І. Аўдзеева.**



Лінгафонны кабінет — добры памочнік студэнта ў час сесіі.

# КНІГІ ВЫДАВЕЦТВА БДУ

Да юбілею ўтварэння БССР і КПБ у выдавецтве БДУ падрыхтаван шэраг кніг па розных галінах навуковых ведаў. Асабліва плённа папрацаваў да гэтай даты калектыў рэдакцыі літаратуры па гісторыі і навуковаму камунізму, выпусціўшы арыгінальныя творы, манаграфіі, зборнікі дакументаў гістарычнай тэматыкі.

«Рэвалюцыйны авангард працоўнай моладзі Заходняй Беларусі (1921—1939)» — так называецца зборнік гістарычных дакументаў на рускай і беларускай мовах. Гэта першая публікацыя дакументаў на рускай і беларускай мовах. Гэта першая публікацыя дакументаў аб барацьбе камсамола і моладзі Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам КПЗБ супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Яны яскрава расказваюць аб удзеле юнакоў і дзяўчат у забастоўках, у правядзенні рэвалюцыйных свят, стварэнні адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту, у кампаніях салідарнасці з рэспубліканскай Іспаніяй, за ўз'яднанне з БССР.

Праблемам станаўлення і развіцця камсамольскага друку Беларусі прысвечана кніга А. Г. Слукі «Голас рэвалюцыйнай моладзі». У ёй дано сістэматычнае даследаванне маладзёжнага друку Беларусі, прасочваецца працэс фарміравання, станаўлення і развіцця камсамольскай прэсы. На вялікім фактычным матэрыяле паказана роля газет і часопісаў ва ўмацаванні камсамольскіх арганізацый, мабілізацыі моладзі на выкананне рашэнняў Камуністычнай партыі.

Работа В. Н. Сідарцова «Дзяржаўная дзейнасць рабочага класа БССР» раскрывае асноўныя палажэнні У. І. Леніна аб вядучай ролі рабочага класа ў кіраванні дзяржавай, значэнне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў здзяйсненні рабочым класам Беларусі кіраўніцтва нацыянальнай дзяржавай. У кнізе аналізуюцца перадумовы разгортвання актыўнасці рабочых мас БССР, паведамляюцца звесткі аб вядомых беларускіх дзяржаўных і грамадскіх дзеячах — прадстаўніках рабочага асяроддзя.

Кніга П. Я. Мурашкі «Асобага прызначэння... (1918—1924 гг.)» прысвечана гісторыі стварэння ў Беларусі атрадаў асобага прызначэння і выкарыстання іх для абароны і ўмацавання Савецкай улады на месцах. У рабоце над кнігай аўтар выкарыстоўваў архіўныя матэрыялы, успаміны ўдзельнікаў і відавочцаў апісваемых падзей, апублікаваныя раней працы, ваенна-гістарычныя манаграфіі і перыядычны друк. Абагульніўшы сабраны матэрыял, аўтар аднавіў гістарычна сапраўдную, яркую карціну тых дзён.

«Сялянства Беларусі на шляху да сацыялізму» — першая гісторыяграфічная работа. Аўтар манаграфіі старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ В. Н. Міхнюк на аснове глыбокага аналізу прац савецкіх гісторыкаў паказвае ступень вывучанасці пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі напярэдадні рэвалюцыі, здзяйснення ленінскага дэкрэта аб зямлі, калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, сацыяльна-эканамічнай структуры паслякастрычніцкай вёскі Беларусі. Ён выяўляе спрэчныя пункты гледжання, якія маюцца ў літаратуры, і вызначае новыя задачы, патрабуючыя навуковага вырашэння. Кніга асвятляе праблемы гісторыяграфіі сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі рэспублікі да масавай калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

У манаграфіі Н. К. Сакалова «Партыйнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і выхаваннем кадраў вышэйшай школы БССР» даследуецца кіруючая і арганізатарская дзейнасць партыйных камітэтаў і арганізацый Беларусі па падрыхтоўцы, расстаноўцы, выхаванню, павышэнню кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу ВНУ ў 1945 — 1975 гг. Вялікая ўвага ўдзелена ўдасканаленню дзейнасці аспірантуры, развіццю навукова-даследчай работы ў ВНУ, павышэнню навукова-тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню педагагічных кадраў вышэйшай школы БССР.

Бібліяграфічны ўказальнік «У. І. Пічэта» з'яўляецца першым вопытам складання бібліяграфіі прац вучоных БДУ імя У. І. Леніна.

Аматараў народнай творчасці—фалькларыстаў парадуе зборнік «Беларуская народная творчасць савецкага перыяду» (складальнік В. А. Захарава). У яго ўключаны найбольш змястоўныя і дасканалыя ў мастацкіх адносінах творы розных жанраў, якія запісаны ў час фальклорных экспедыцый па рэспубліцы.

Манаграфія А. А. Семяновіча «Ад вытокаў да сталасці (беларуская драматургія 1917—1945)» прысвечана праблеме развіцця беларускай драматургіі сацыялістычнага рэалізму. У ёй галоўная ўвага звернута на творчасць пісьменнікаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай савецкай драматургіі. Аналізуюцца п'есы Я. Купалы, Я. Коласа, В. Галубка, М. Чарота, Ц. Гартнага, М. Гарэцкага, Н. Бываеўскага, В. Гарбацэвіча, М. Зарэцкага, В. Сташэўскага і іншых.

Кніга С. Д. Міхайлавай «Актыўны экран» прысвечана актуальным праблемам сучаснага беларускага дакументальнага кіно, такім важным аспектам яго развіцця, як сацыяльная накіраванасць кінадакументалістыкі, сацыяльная значымасць асобы на экране.

«Актыўны экран» узнімае актуальныя праблемы сучаснага кінамастацтва — адлюстраванне сацыяльнай тэмы сродкамі дакументальнага экрана. У кнізе выяўлены традыцыі і пошукі, вызначаны першачарговыя задачы кінематаграфістаў у гэтай галіне. Каштоўнасць яе—у шырыні прыцягнення фактычнага матэрыялу, цікавым і дакладным аналізе беларускіх і савецкіх фільмаў, абгрунтаваных тэарэтычных вывадах.

С. ХАДАСЕВІЧ.

# УЗЛЁТ ДА ЗОР,

Людзі спрадвеку імкнуліся спазнаць свет па законах прыгажосці, дакрануцца душой да таямнічай гармоніі гукаў, фарбаў і форм. Так паявілася паэзія. І яна заўжды будзе жыць, пакуль будуць жыць чалавечыя думкі і справы.

Для тых студэнтаў, якія спрабуюць сябе ў літаратуры, заўсёды адкрыты дзверы «Узлёта» — літаб'яднання, вядомага не толькі ва універсітэце, але і ў рэспубліцы. Студэнты прыходзяць сюды, каб паспрачацца, абмеркаваць новыя вершы, пагутарыць аб праблемах маладой беларускай літаратуры.

Нязменны кіраўнік літаб'яднання — прафесар, доктар філалагічных навук, паэт Алег Антонавіч Лойка.

**— Алег Антонавіч, чаму і калі быў створан «Узлёт»?..**

Паэтычнае асэнсаванне свету—адна з самых цікавых форм праяўлення чалавечай свядомасці. Тут, безумоўна, асноўная роля належыць самой асобе. Але паэт жыве і творыць не ў пустаце, а сярод людзей, у псіхалагічным кантакце з імі. Пачынаючым паэтам універсітэта жыццёва патрэбны былі творчыя дыскусіі, аб'ектыўны аналіз сваіх вершаў. Таму ў сакавіку 1964 года пры дапамозе парткома БДУ і ўзнікла наша літаб'яднанне.

**— Мы ведаем, што маладыя паэты не толькі абмяркоўваюць свае вершы, але і выдаюць кніжкі. «Вёсны», напрыклад.**

«Вёсны» — не першы калектыўны зборнік студэнтаў нашага універсітэта. Калі ўспомніць кнігу «Падарунак» (1958 г.), то гэта пяты выхад творчай моладзі універсітэта на шырокую грамадскасць. У «Падарунку» пачыналі такія сёння ўжо шырока вядомыя паэты, як лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы і прэміі ЛКСМБ Рыгор Барадулін, лаўрэаты прэміі ЛКСМБ Генадзь Бураўкін і Васіль Зуёнак. У зборніку «Узлёт» (1965 г.) выступалі вядомыя ўжо сёння паэты Рыгор Семашкевіч, Казімір Камейша, Мар'ян Дукса. Стартавай пляцоўкай для Юркі Голуба, Алеся Разанава, Яўгеніі Янішчыц, Віктара Ярца, Сяргея Законнікава стаў зборнік «Натхненне» (1967 г.), васемнаццаць узлётаўцаў было прадстаўлена ў анталогіі «Універсітэт паэтычны» (1971 г.).

# ДА ПОДЗВІГУ,

**— А які сённяшні дзень узлётаўцаў?..**

Гэта пошукі, імкненне зразумець патрэбы свайго часу, намаганне знайсці сваё «я» ў паэзіі. Да нас кожны год прыходзяць усё новыя пачаткоўцы, і гэта радуе. На апошнім пасяджэнні чыталі свае вершы Уладзімір Емяльянчык, студэнт IV курса, і Ала Канапелька (I курс, філфак). Трэба сказаць, што «Узлёт» не ёсць нешта абасобленае ад усяго таго, што не датычыцца, на першы погляд, паэзіі. Я ўжо і не магу дакладна сказаць, колькі ў нас было сустрэч са школьнікамі, студэнтамі тэхнікумаў, рабочымі прадпрыемстваў. Нядаўна мы з цікавасцю наведалі майстэрню мастака Міхася Басалыгі. Наперадзе — гутарка маладых паэтаў з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР скульптарам Іванам Міською, выступленне на Беларускім тэлебачанні са сваімі вершамі.



Жывём, як бачыце, цікава і напружана.

**— Што Вы параіце тым, хто першы раз узяўся за пяро?..**

Вас чакае «Узлёт». І калі вы адчуваеце, што жаданне пісаць — унутраная патрэба, а не даніна модзе, гэта вельмі добра. Толькі тады вашы думкі і мары змогуць ператварыцца ў сапраўды паэтычныя радкі, якія дойдуць да розуму і сэрца чытача.

**— Што ж, будзем спадзявацца, што за «Вёснамі» прыйдзе шчодрае на добрыя вершы паэтычнае «лета», і ніколі не будзе «зім».**

# ДА ШЧАСЦЯ

А «зім» не будзе, бо, як сказаў паэт:

Паэзіі ніколі не прапасці.
Ёй рух дае прырода
і народ,
Паэзія ж дае народу
ўзлёт
Да сініх зор,
Да подзвігу,
Да шчасця.

Інтэрв'ю правёў
А. МІХАЙЛАЎ.



# У паход пайсці—праблема,

## ЦІ ЧАМУ ПАМЕНШЫЛАСЯ КОЛЬКАСЦЬ ТУРЫСТАЎ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Каб расказаць аб развіцці турызму ў нашым універсітэце, зробім невялічкі экскурс у мінулае дзесяцігоддзе. Тады, у 60-я гады, Белдзяржуніверсітэт лічыўся флагманам па развіццю турызму сярод ВНУ рэспублікі. Выкладчыкі і студэнты здзяйснялі паходы розных катэгорый складанасці ў многія раёны нашай краіны. Кожны год падрыхтоўваліся цэлыя групы спартсменаў высокіх разрадаў.

Але ў канцы 60-х—пачатку 70-х гадоў змяніліся пакаленні турыстаў, і гэта адбілася на развіцці турызму. Так, напрыклад, у 1975 годзе было падрыхтавана ўсяго толькі 5 турыстаў-трэцяразраднікаў, а ў 1977 — 32 спартсмены III разраду і ўсяго толькі 2 чалавекі атрымалі другі разрад па турызму.

У канцы 1977 года пры спартыўнай кафедры універсітэта пачала працаваць секцыя турызму, а ў пачатку 1978 года быў рэарганізаван турысцкі клуб. Дзякуючы гэтым намаганням вызначыліся станоўчыя зрухі ў турысцкім жыцці універсітэта. Палепшылася работа па падрыхтоўцы турыстаў-разраднікаў. З планам гадавой падрыхтоўкі — 150 трэцяразраднікаў і 20 турыстаў II разраду—клуб у гэтым годзе амаль справіўся. Акрамя таго, упершыню за гісторыю існавання клуба падрыхтавана 22 суддзі па тэхніцы пешаходнага турызму. У другім семестры мінулага навучальнага года пры клубе працавала школа турысцкіх арганізатараў — малодшага інструктарскага звяна. Мы спадзяёмся, што яе выпускнікі стануць ініцыятарамі папулярызацыі і развіцця гэтага цікавага і карыснага віду спорту на факультэтах.

Састаўной часткай турысцкай работы з'яўляецца правядзенне ў рамках Усесаюзнай турысцкай экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР» «зорных паходаў» па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Гэтыя паходы выхоўваюць у студэнтаў пачуццё патрыятызму, дазваляюць сутыкнуцца з гераічным мінулым і выдатным цяперашнім нашай краіны. «Зорныя паходы» адносяцца, як правіла, да паходаў I катэгорыі складанасці, праходзяць па тэрыторыі Беларусі і з'яўляюцца асноўным звяном падрыхтоўкі спартсменаў III разраду і праводзяцца звычайна ў перыяд зімовых студэнцкіх канікулаў. У мінулым навучальным годзе практыкаваліся турысцкія паходы на майскія і кастрычніцкія святы. Але яны пакуль не носяць масавага характару. Многія факультэты практычна не ўдзельнічалі ў вясновым паходзе 1978 года. Прычына невялікай колькасці ўдзельнікаў гэтых паходаў яшчэ і ў тым, што наш рэктарат не дазваляў адначасовага выхаду вялікай колькасці турыстаў, хаця ў іншых ВНУ гэта паспяхова практыкуецца (у педагагічным інстытуце і БПІ ў адным такім паходзе ўдзельнічаюць да 250—300 чалавек).

Для выканання норм больш высокіх разрадаў неабходна здзяйсняць паходы II—V катэгорый складанасці, якія магчымы толькі за межамі нашай рэспублікі (Урал, Каўказ, Кольскі паўвостраў і інш.).

Пры спартыўным і турысцкім клубах БДУ працуе маршрутна-кваліфікацыйная камісія, якая сама выпускае турыстаў у паходы I катэгорыі складанасці па БССР, хадайнічае перад вышэйстаячай маршрутна-кваліфікацыйнай камісіяй аб дазволе выхаду груп на больш складаныя маршруты. Цяпер гэты працэс займае шмат часу, аднімае шмат сіл, і гэта адмоўна адбіваецца на развіцці турызму ў БДУ — рэзка скарацілася колькасць паходаў II і вышэйшых катэгорый складанасці (на гэтых зімовых канікулах іх будзе толькі два).

Адной з прычын, якія перашкаджаюць развіццю турызму ў нашым універсітэце, з'яўляецца адсутнасць амуніцыі. Усё пытанне зводзіцца да выдзялення спецыяльнага памяшкання для яе захавання. Спартыўны клуб выдзяляе сродкі турыстам для арэнды ці пракату палатак, рукзакоў, спальных мяшкоў, якія неабходны ў паходах, але на базе пракату Мінскага аблсавета па турызму не заўсёды можна атрымаць патрэбную амуніцыю ў патрэбнай колькасці.

Акрамя таго, турыстам няма дзе сабрацца, каб абмеркаваць паходы, прагледзець фатаграфіі ці слайды, сустрэцца з цікавымі людзьмі. Адзначым, што ў 60-я гады турклуб меў два свае пакоі.

І яшчэ адно: ва універсітэце, на жаль, вельмі мала інструктараў па турызму. Тлумачыцца гэта тым, што студэнт толькі на старэйшых курсах мае магчымасць выканаць інструктарскія нарматывы і, атрымаўшы права быць інструктарам, пакідае універсітэт. Таму трэба студэнтаў з малодшых курсаў накіроўваць на вучобу ў школу інструктараў пры Мінскім абласным савеце па турызму і экскурсіях і па магчымасці прадастаўляць ім у першую чаргу права ўдзелу ў заліковых паходах і ў паходах, кіраўніцтва якімі ўваходзіць у нарматывы інструктара па турызму.

А. НОВІКАЎ,
старшыня клуба турыстаў БДУ.




**Сесія, зімовая сесія нарэшце завітала і на кафедру смехаробства, асабовы састаў якой сустрэў яе як свята. Да сесіі быў падрыхтаван чарговы нумар нашай насценкі, вынікам выдатна зданай сесіі прысвяціў новы верш наш паэт, а дацэнт Незалікін цяпер ходзіць на кожны экзамен з фотаапаратам і з дапамогай Міколы Дубовіка робіць неблагія здымкі. Адзін з іх змешчан сёння на нашай фотавітрыне.**

**Зразумела, са спіны цяжка пазнаць студэнта Шуру Шпору, але ён ці не ён на здымку,—гэта, нарэшце, не прынцыпова. Важны сам факт паспяховага выкарыстання фотазброі ў барацьбе са шпаргалкамі.**

## З насценгазеты «ЗНАНИЯ—СИЛОЙ!»

**Если ты знаешь, что ничего не знаешь — это не беда. Беда, если это знает преподаватель.**

**Отрицая свои ошибки, непогрешимым всё равно не станешь.**

**Его грызла совесть. Но он ей был не по зубам.**

**Правило было настолько хорошим, что его сделали исключением.**

**Не будь Прометея, не было бы и Герострата.**

**Преимущество плоских мыслей в том, что их больше укладывается в голове.**

**Острую мысль следует подавать острым концом вперёд.**

**Если бы комплимент был истиной — он был бы просто информацией.**

# Вучоныя казкі

### Фізіка

## К. К. Д.

Спачатку возьмем гару. Вялізную гару, якая тоіць у сабе невылічальныя запасы энергіі.

Потым возьмем мыш. Звычайную мышку, якая нічога ў сабе не тоіць. Адносіны народжанай мышкі да нарадзіўшай яе гары называюцца каэфіцыентам карыснага дзеяння.

### Матэматыка

## Скарачэнне дробаў

— Вы чыталі аб скарачэнні дробаў?

— Падумаць толькі — зноў скарачэнне.

Але, аказваецца, дробы дарма хваляваліся. Шэсць чатырнаццатых скарацілі да трох сёмых. Восем дванаццатых — да двух трэціх. Словам, адзін дроб замянілі другім, абсалютна роўным яму па колькасці.

Вось гэта і называецца скарачэннем.

### Геаграфія

## Мыс

Мыс выдаецца ў мора. Мыс адчувае, што ён выдатны.

— Я так акружаны вадой. Мяне даўно можна называць паўостравам... Але калі вам усё роўна, завіце мяне паўкантынентам...

### Літаратура

## Яблык разладу

Багіні спрачаюцца аб прыгажосці.

— Ну-ка, Парыс, каму ты аддасі яблык?

Марудзіць Парыс. Гера прапануе яму ўладу, Афіна — славу, Афрадыта — самую прыгожую жанчыну.

Марудзіць Парыс. Ен любіць і ўладу, і славу, і жанчын. Але больш за ўсё Парыс любіць яблыкі.

# ВЯСЁЛЫ АЛОВАК




— Прафесар, зараз жа стаўце ў залікоўку «выдатна» ці я вам зраблю такое кароткае замыканне...

# ПАРНАСІК



Міністаронка «Ружовага ранка»

Алесь Усеня

## РАЗМОВА Ў ТРАМВАІ

### (студэнцкі жарт)

Ты, хлопча, дзеда
выбачай —
Скажы: студэнцік ты,
бадай?
Выдатнік — бачу па
вачах —
Такі худы, што глянуць
страх.
З навукі, мусіць жа,
і ўсох.
І акуляры, далібог,
Спаўзаюць аж да
барады...
Дык што: выдатнік,
хлопча, ты?
І што за дзіўнае, браток,
Трымаюць рукі паліто?
—Ды што ты, дзядзька,
— бог з табой!
На што я здатны?!
А на руках?
То сябар мой.
Вось ён — выдатнік...

# Дасье лабаранта Пісулькіна

## «Вялізныя, як вароты свірна...»

У ядзернай фізіцы для адзнакі папярочных сячэнняў ядзерных рэакцый прымяняецца тэрмін «барн». Калі зазірнуць у слоўнік, то са здзіўленнем знаходзіш, што гэта слова азначае свіран, сарай. Паўстае пытанне, якія адносіны мае свіран да ядзерных рэакцый?

Зацікавіўшыся гэтым пытаннем, італьянскі фізік Э. Сегрэ спытаўся ў Ганса Бетэ, чым той кіраваўся, уводзячы ў навуку такі тэрмін.

— Ды калі мы пачалі вымяраць папярочныя сячэнні захопу цеплавых нейтронаў у розных элементаў, яны аказаліся вялізнымі, як вароты свірна,—адказаў Бетэ. — Таму, дарэчы кажучы, на вокладцы даведніка па сячэннях мы змясцілі вароты свірна...

## «ХАЧУ ПАЗБАВІЦЬ АФІНЯН АД НОВАГА ЗЛАЧЫНСТВА...»

Вялікі філосаф Арыстоцель у жыцці быў малапрыемным і рэзкім чалавекам. Таму, калі памёр Аляксандр Македонскі — яго выхаванец і пакравіцель,— Арыстоцель зразумеў, што яго можа спасцігнуць лёс філосафа Сакрата, які быў асуджан афінянамі на смерць.

Не чакаючы такога павароту спраў, Арыстоцель паспяшаўся збегчы з Афін. «Хачу пазбавіць афінян ад новага злачынства супраць філасофіі»,— растлумачыў ён сябрам прычыну свайго ўцёку.

# Наша фотавітрына



### Спроба гумарыстычнага пяра

# АЗНАЯМЛЯЛЬНАЕ ПЫТАННЕ

Унутры Раі ўсё ходарам хадзіла ад страху. Трэба ж, яна ўпершыню ішла на заданне. Каардынаты ўказаў сам рэдактар: цэнтральны універмаг горада.

Дырэктар магазіна пасля нядоўгіх разважанняў прапанаваў: «А вазьміце загадчыцу аддзела цацак, надзейную працаўніцу, актывістку».

Ёю аказалася невысокая маладая дзяўчына, з добрымі чорнымі вачыма. «Нездарма, відаць, яе лічаць надзейнай. Гэта якасць тут важная», — вітаючыся, думала Рая. Пачынаючая журналістка дастала шырокі блакнот і прыступіла да справы:

— Ваша прозвішча?

Дзяўчына ўсміхнулася і хуценька пачала гаварыць:

— Для таварышаў па працы я проста — Надзейная, а мама,— тут яна засаромелася,—кліча цудадзейнай.

Раі паказалася нясціплым такое прызнанне, і яна спыніла дзяўчыну:

— Прабачце, мне патрэбна ваша прозвішча.

— Прадаўшчыца, крыху пачырванеўшы, паўтарыла сказанае.

— Вы мяне не разумееце,— пачала цярпліва тлумачыць журналістка.— Я яшчэ не пытаюся аб адносінах да вас. Мне патрэбна пакуль толькі адно ваша прозвішча.

— Ды ў мяне і ёсць адно прозвішча.

— Хопіць, — абарвала яе Рая, тым больш, што дзяўчына ёй ужо не падабалася.

— Не хочаце адказваць, то я праінтэрв'юірую каго-небудзь іншага,— з гонарам карэспандэнта раённага выдання заключыла Рая.

На вочы загадчыцы набеглі слёзы. Але Рая аказалася непрыступнай. На развітанне параіла:

— Пастарайцеся больш ніколі не ставіць сябе вышэй калектыву.

Абураная, яна накіравалася зноў да дырэктара, ды хутка прыпынілася каля Дошкі гонару, прачытаўшы пад знаёмай фотакарткай — Валянціна Надзейная...

З таго часу Рая загадзя знаёміцца з прозвішчамі інтэрв'юіруемых і старанна запісвае іх у свой шырокі блакнот.

**Г. СІДАРОВІЧ.**

# Закаханы «заяц»

Пятро выйшаў з будынка інстытута і звярнуў да прыпынку трамвая. Ускочыўшы ў першую «адзінку», ён «павіс» на верхнім дзяржанні. За ім увайшла дзяўчына. Бялявая, з чорнымі вачыма,— яму здалося, што дзесьці ён яе ўжо бачыў. Адразу захацеў сказаць ёй, але, успомніўшы, што гэта ўжо даволі стары спосаб заляцання, адвярнуўся.

Яна зірнула на яго і стала крыху воддаль. «Гэтыя вочы. І сапраўды, я іх дзесьці бачыў, але дзе? Учора на факультэцкім вечары? Магчыма, у інтэрнаце? Дык дзе ж?»

Не звяртаючы ніякай увагі на штуршкі пасажыраў, якія заходзілі ў вагон, Пятро стаяў, нібы ўкопаны. Спадцішка кідаў на яе позіркі і ўсё больш і больш адчуваў, як часцей б'ецца сэрца, як твар залівае чырвань.

«Зараз падыйду, пазнаёмлюся, а там усё пойдзе сваёй чаргой»,— задаволены думкай, ён палез у кішэню за люстэркам. Ён ужо прадчуваў, як яна яму лагодна ўсміхнецца...

— Прабачце,— Пятро, захоплены марамі, ад нечаканасці ўздрыгнуў. Перад ім стаяла яна, бялявая, з чорнымі вачыма.

— Малады чалавек, ваш білецік, калі ласка.

Пятро анямеў. Толькі зараз ён заўважыў на яе руцэ чырвоную павязку.

Успаміны ўсплылі самі. Нядаўна ён ужо быў аштрафаван гэтымі чорнымі вачыма.

**А. РУСАКОВІЧ.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 109. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 10536